# *Памяці таварыша*

## ГАННА МАРТЫНАЎНА БАЗЫЛЕНКА



16 студзеня 1980 года памерла Ганна Мартынаўна Базыленка, вядомы беларускі мовазнавец, высокакваліфікаваны педагог, шчыры працаўнік на ніве роднай культуры.

Г. М. Базыленка нарадзілася 4 красавіка 1908 года ў вёсцы Арахі былога Аршанскага павета Магілёўскай губерні ў малазямельнай сялянскай сям'і.

Лепшую вучаніцу і найбольш ініцыятыўную камсамолку сельсавет паслаў на падрыхтоўчыя курсы Аршанскага рабфака. Скончыўшы іх, у 1924 годзе Ганна Мартынаўна становіцца студэнткай Аршанскага педагагічнага тэхнікума, неўзабаве пераведзенага ў Віцебск. Маладая студэнтка, меўшая схільнасць да літаратуры, была прынята ў члены Віцебскай філіі Усебеларускага літаратурнага аб'яднання «Маладняк». Яна пачынае актыўна ўдзельнічаць у літаратурных вечарах і дыспутах, піша вершы, апавяданні і п'есы, некаторыя з іх публікуе пад сваім прозвішчам і пад псеўданімам Ганна Арахоўская ў зборніках Віцебскай маладнякоўскай філіі «Пачатак» (1926) і «Світанне» (1927), а таксама ў мясцовым перыядычным друку. На пачынаючую пісьменніцу звярнуў увагу Якуб Колас. Менавіта ён, калі Ганна Мартынаўна скончыла Віцебскі педагагічны тэхнікум, параіў кіраўніцтву «Маладняка» рэкамендаваць здольную выпускніцу на вучобу ў Беларускі дзяржаўны універсітэт, дзе сам тады выкладаў методыку беларускай мовы.

З 1927 па 1931 год Ганна Мартынаўна—студэнтка літаратурна-лінгвістычнага аддзялення гэтай вышэйшай навучальнай установы.

Скончыўшы універсітэт, Г. М. Базыленка працавала выкладчыцай беларускай мовы спачатку ў Слуцкім, затым у Мінскім педагагічных тэхнікумах, а з 1933 па 1939 год—навуковым работнікам Інстытута мовы і літаратуры Акадэміі навук БССР. Яна прымала ўдзел у стварэнні двух лексікаграфічных даведнікаў—«Руска-беларускага слоўніка» (1937) і «Практычнага беларуска-рускага слоўніка». Апошняму слоўніку не пашчасціла быць выдадзеным: падрыхтаваны да друку рукапіс яго загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны. З даваенных навуковых даследаванняў Ганны Мартынаўны заслугоўвае ўвагі артыкул «Мова ранняй творчасці Якуба Коласа», апублікаваны ў зборніку «Пісьменнік і мова» (1934).

На працягу 1939—1941 вучэбных гадоў Г. М. Базыленка выкладала рускую мову ў Рэспубліканскім тэатральным вучылішчы. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, эвакуіравалася на ўсход.

Адразу ж пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Ганна Мартынаўна вяртаецца ў Мінск і пачынае педагагічную дзейнасць у Беларускім дзяржаўным універсітэце. На пасадзе старшага выкладчыка, а з 1953 года—дацэнта кафедры рускай мовы і агульнага мовазнаўства яна працавала да выхаду на пенсію ў 1970 годзе. Чатыры гады (1949—1953) была адначасова намеснікам дэкана філалагічнага факультэта. У 1952 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму «Устойлівыя словазлучэнні ў мове Якуба Коласа».

Па пытаннях моўнага майстэрства свайго любімага пісьменніка і тэорыі беларускай фразеалогіі Ганна Мартынаўна апублікавала рад цікавых даследаванняў:

«Вобразы і кампазіцыя паэмы «Адплата» Якуба Коласа» (1946), «Роля Якуба Коласа ў развіцці беларускай літаратурнай мовы» (1952), «Да пытання аб фразеалагічных адзінках у беларускай мове», «Роля асноўнага слоўнікавага фонду ва ўтварэнні і развіцці ўстойлівых фразеалагічных словазлучэнняў у беларускай мове» (1954), «Параўнальныя словазлучэнні ў сучаснай беларускай літаратурнай мове. Па матэрыялах творчасці Я. Коласа» (1957), «Намінатыўныя сказы ў творах Я. Коласа» (1963), «Фразеалагічныя словазлучэнні таўталагічнага характару» (1970).

Некалькі каштоўных даследаванняў Г. М. Базыленка прысвяціла граматычнаму ладу беларускай мовы, з якіх найбольш грунтоўным з'яўляецца манаграфія «Пабочныя і ўстаўныя словы, словазлучэнні і сказы ў сучаснай беларускай літаратурнай мове» (1964).

Ганна Мартынаўна—сааўтар падручніка для філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў «Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Марфалогія» (1957) і фундаментальнай калектыўнай манаграфіі «Граматыка беларускай мовы, т. І. Марфалогія» (1962), выдадзенай Акадэміяй навук БССР. Для першай працы яна напісала раздзелы «Прыназоўнік», «Злучнік», «Часціцы» і «Выклічнік», а для другой—раздзелы «Прыназоўнік», «Часціцы» і «Выклічнік».

Сорак гадоў свайго жыцця аддала Г. М. Базыленка падрыхтоўцы педагагічных кадраў і развіццю беларускага мовазнаўства. Яна была ўзнагароджана медалём « За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», Граматай Вярхоўнага Савета БССР, некалькімі граматамі рэктарата універсітэта, тройчы (1950, 1953, 1955 гады) выбіралася дэпутатам Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных. Светлую памяць аб Ганне Мартынаўне Базыленка яе былыя калегі па працы, знаёмыя і шматлікія вучні захаваюць у сваіх сэрцах назаўсёды.

**І. К. Германовіч**